# Экскурсія «Калі хочаш міру - памятай пра вайну»

**Н. К. Санько,** настаўнік гісторыі
вышэйшай катэгорыі, кіраўнік
народнага гісторыка-краязнаўчага
музея

Застаўшыся з маленства на вайне,
Я аднаго хачу, мая краіна:
Каб гэта скончылася ўсё на мне.
Каб гэта ўсё не стала доляй сына.

*Ніл Гілевіч*

Экскурсавод: Людзі з даўніх часоў марылі аб неразгаданай таямніцы, нязведаных краінах, незвычайных знаходках. А што за вандроўка без чароўных сродкаў перамяшчэння ?! Якія з іх вы ведаеце? (Адказы.)

- Правільна, дыван-самалёт, машына часу. Ці існуюць яны ў рэальнасці? А ці існуе машына часу? (Адказы)

-Для ажыццяўлення сваёй мары людзі прыдумалі «машыну часу». Яна ёсць ва многіх школах нашага раёна. Мы часта становімся яе «пасажырамі». Адгадайце, што гэта за «машына» па наступных прыкметах:

- у «машыне» трэба выконваць асаблівыя правілы паводзін, паводзіць сябе ціха, быць уважлівым, асцярожным, каб не перашкаджаць іншым і не збіцца са шляху;
- рухавіком «машыны» з'яўляюцца рэдкія экспанаты, сярод якіх мноства фатаграфій, лістоў, асабістых рэчаў і інш.;
- кіруюць ёю людзі, прафесіі якіх звязаны са спадчынай, гісторыяй.

- Хто здагадаўся, што гэта за «машына»? (Адказ: музей)

- Вось ужо больш за 60 гадоў у Валеўскім дзіцячым садзе-сярэдняй школе дзейнічае гісторыка-краязнаўчы музей, адзін з найстарэйшых школьных музеяў Рэспублікі Беларусь, створаны ў 1955 годзе. У 1968 годзе было прысвоена званне Народнага, якое пацвярджаецца кожныя 5 гадоў. Распавесці пра музей дапаможа чамадан. Тэма нашай экскурсіі «Калі хочаш міру - памятай пра вайну».

Мы пагаворым аб тым, як у неверагодна складаных умовах чалавек захаваў у сабе чалавека, як сіла чалавечага духу аказалася мацнейшай металу і агню, як згуртавала людзей адна на ўсіх мэта, любоў і нянавісць. (На фоне музыкі гучаць словы).

Мова лічбаў скупая, але ўслухайцеся і ўявіце ... Калі б мы захацелі ўшанаваць адной хвілінай маўчання кожнага з загінуўшых у вайну савецкіх людзей, то чалавецтву прыйшлося б анямець на 50 з лішнім гадоў. (гучыць першы куплет песні пра Брэсцкую крэпасць).

-У нашым «Музеі-чамадане» вы бачыце невялікую частку даху Брэсцкай крэпасці. Тут знаходзіцца 102 прабоіны ад куль і снарадаў. Гэта сведчанне таго, якія цяжкія баі ішлі там у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Сёння музей і Мемарыял Брэсцкай крэпасці- героя сталі цэнтрам ваенна-патрыятычнага выхавання. Тысячы людзей з усяго свету едуць сюды, каб ушанаваць памяць і подзвіг герояў. У 1941годзе байцы больш за 30 нацыянальнасцей стаялі на смерць за незалежнасць агульнай Айчыны. Наш абавязак - захаваць і данесці да будучых пакаленняў гэты ўнікальны сімвал подзвігу і доблесці служэння Радзіме. (гучыць апошні куплет песні пра Брэсцкую крэпасць).

Вялікі ўклад у перамогу над фашызмам ўнеслі партызаны. У нашым «Музеі-чамадане» вы бачыце фота партызанскай стаянкі.Дзе размяшчаліся партызанскія стаянкі? Чым займаюцца партызаны, прадстаўленыя на дадзеным фота?

(Адказ: у глухім лесе. Камандзір прымае даклад разведчыкаў, каваль рамантуе зброю, партызаны адпраўляюцца на заданне, вядуць палоннага немца, кухарка рыхтуе абед на імправізаванай кухні.)

- Баі былі гарачыя, надвор'е таксама. І добра, калі ў партызана з сабой была біклажках з вадой. Вы бачыце яе ў нашым «Музеі-чамадане». Нашу Беларусь у гады вайны называлі Партызанскай Рэспублікай.Усёй краіне вядомы імёны партызанскіх камандзіраў: Каржа Васілія, Бумашкова Ціхана, Заслонава Канстанціна, разведчыка штаба партызанскай брыгады Марата Казея. Бухенвальд, Асвенцым, Дахау, Саласпілс, Трасцінец - лагеры смерці, праз якія прайшлі сотні тысяч ваеннапалонных і мірных жыхароў дзясятка краін. У Саласпілскім лагеры смерці ў дзяцей для патрэб параненых нямецкіх салдат і афіцэраў выкачана 3500 літраў крыві. У нашым «Музеі-чамадане» маецца нагрудны знак вязня Бухенвальда. На ім паказаны нумар уладальніка. У лагеры ў чалавека не было ні імя, ні прозвішча, а толькі нумар. У Бухенвальдзе загінула 56 тысяч вязняў. (Гучыць другі куплет песні Бухенвальдскі набат).

Прайшла вайна. І жыццё, і час рухаюцца наперад. Але вайна жыве ў памяці народа. Наступствы яе распасціраюцца далёка ў часе, яны жывуць у сямейных паданнях, у памяці бацькоў. Яны ва ўспамінах пераходзяць да дзяцей і ўнукаў. Памяццю жыве народ, без яе няма шляху ў будучыню.

(Гучыць апошні куплет песні “Бухенвальдскі набат”).